# Пачынаецца ўсё з любві




Урач агульнай практыкі Галынкаўскай амбулаторыі Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці Марыя Хрыпанкова скончыла лячэбны факультэт ГрДМУ ў 2017 годзе і па размеркаванні прыехала на першае месца працы ў родныя мясціны. За год паспела заслужыць аўтарытэт сярод вяскоўцаў.

З якімі праблемамі давялося сутыкнуцца маладому спецыялісту і як ішоў працэс адаптацыі - пра гэта Марыя Сяргееўна распавяла карэспандэнтам «МВ».

- Першыя месяцы было цяжка, - прызнаецца субяседніца. - Вялікі аб'ём работы, шмат людзей, за здароўе якіх мы ў адказе. 12 населеных пунктаў. Радыус абслугоўвання - 15 кіламетраў. Тры ФАПы - Старасельскі, Снежанскі і Востраўскі. Пад патранажам 1 338 чалавек.

Найперш пачалі дыспансерызацыю. Абнавілі спісы тых, хто стаяў на ўліку ў вузкіх спецыялістаў. Узялі за правіла: у жанчын абавязкова абследаваць малочныя залозы, рабіць цыталагічныя даследаванні, звяртаць увагу на падазроныя новаўтварэнні на скуры і г. д. За паўгода ў 46 чалавек былі выяўлены розныя захворванні. Летам пастаянна бываем на мехдвары, у полі, на зернетаках… Нядаўна ў адной з абследуемых груп у 13 з 15 чалавек быў выяўлены павышаны артэрыяльны ціск, пра які людзі і не здагадваліся. Ім аказалі першую медыцынскую дапамогу і адправілі на даабследаванне. Чатыром упершыню пацвердзілі артэрыяльную гіпертэнзію.

Два разы на год праводзім падворныя абходы. Дапамагаюць старасты вёсак, загадчыкі ФАПаў. Адчувальная падтрымка ад старшыні сельсавета Руслана Архіпчыка. Калі трэба, умее перакanaць вяскоўцаў у неабходнасці пільнай увагі да ўласнага здароўя. Калі раптам з'явяцца праблемы з транспартам - таксама выручыць. Дапамагае і адміністрацыя

Репозиторий ГрГМУ

Зэльвенскай ЦРБ. У любы момант можна атрымаць надзейную падтрымку і слушную параду ад намесніка галоўнага ўрача па МСЭіР Ванды Ільяшэвіч ды іншых.

Калектыў амбулаторыі невялікі: два фельчары ФАПа, памочнік урача, акушэрка, медсястра і дзве санітаркі, але задачы, якія стаяць перад імі, вялікія па сваёй значнасці, бо здароўе - самае дарагое.

На думку Марыі Хрыпанковай, мала быць прафесіяналам: трэба любіць людзей - і тады ўсё абавязкова атрымаецца.

Святлана Хорсун

Репозиторий ГрГМУ